PolotskSU



**OLD BELIEVERS OF NORTHERN BELARUS IN THE SECOND HALF OF 19th – BEGINNING OF 20th CENTURIES: RESETTLEMENT FEATURES AND DEMOGRAPHIC CHARACTERISTICS**

U. AUSEJCHYK

*In the article the features of settlement are analyzed and demographic processes of Old Believers of Northern Belarus in the second half of 19th – beginning of 20th centuries are considered. On the basis of the analysis of statistical materials the main places of Old Believers' residence on the territory of the region have been revealed, the dynamics of their number by separate administrative units has been traced, the correlation of urban and rural population has been analyzed, the urban centers of Old Believers on the territory of the region have been revealed.*
***Key words:*** *Old Believers, Northern Belarus, settlement, areal, population number, Old Believers community, demography, ethnology.*

УДК 395(476.5)«19/20»

# ЭТЫЧНЫЯ АСПЕКТЫ ПАЛЯЎНІЧАЙ КУЛЬТУРЫ БЕЛАРУСАЎ

**Бабіч А.Ю.**
Рэспубліка Беларусь, Наваполацк

*Паляўнічая этыка (ПЭ) разглядаецца ў артыкуле як самастойны і спецыфічны фрагмент паляўнічай культуры беларусаў, які ўключае сукупнасць маральных праблем і каштоўнасцяў, звязаных са здабычай дзікіх жывёл. ПЭ шмат у чым вызначае сацыяльна і экалагічна значныя паводзіны чалавека ў працэсе асваення прыродных рэсурсаў. Спалучэнне нарматыўнага і дэскрыптыўнага падыходаў у вывучэнні дадзенага пытання дазваляе разглядаць ПЭ не толькі ў класічным разуменні прафесійнай этыкі (калектыўны маральны вопыт), а таксама прасачыць сувязь ПЭ з суб'ектыўнымі перажываннямі паляўнічага, яго асабістым вопытам, індывідуальным разуменнем дабра і справядлівасці.*
***Ключавыя словы:*** *традыцыя, паляўніцтва, паляванне, промысел, этыка, паляўнічая этыка, рэсурсы жывёльнага паходжання, прафесійная этыка, этналогія, беларусы.*

**Уводзіны.** Падчас паляванняў паводзіны чалавека вызначаюцца не толькі афіцыйнымі нормамі і прадпісаннямі, акрэсленымі дзеючым заканадаўствам, але шмат ў чым – асабістымі этычнымі прынцыпамі, поглядамі, перакананнямі. Паляўнічая прафесійная этыка ўяўляе сабой самастойны спецыфічны фрагмент паляўнічай культуры беларусаў і ўключае сукупнасць маральных праблем і каштоўнасцяў, звязаных са здабычай дзікіх жывёл. Аўтару падаецца немэтазгодным разглядаць прафесійную этыку беларускіх паляўнічых (ПЭ) як адзіны нязменны маральны кодэкс, цэласную сістэму маральных прынцыпаў, нормаў і правіл. Таму ў артыкуле беларуская прафесійная этыка паляўнічых прадстаўлена перш за ўсё як калектыўна сфарміраваныя спосабы дзеяння ў тыповых сітуацыях, стэрэатыпы паводзін, працэс фарміравання якіх адбыўся ў тым ліку пад уплывам этнакультурных традыцый рэгіёну. Класіфікацыі паляўнічай этыкі традыцыйна будуецца на размежаванні этычных норм у адносінах да прыроды і жывёльнага свету і норм, якія датычуць іншых паляўнічых. Аўтар імкнуўся па магчымасці прытрымлівацца дадзенага прынцыпу падзелу этычных норм пры вылучэнні сэнсавых частак.

**Асноўная частка. *Паляванне і правы жывёлы.*** Прыгадаем, што паляванне разумее пад сабой пошук, высочванне, пераслед і здабычу асобных відаў дзікіх жывёл. У сувязі з гэтым, першыя пытанні паляўнічай этыкі можна сфармуляваць так: "Ці этычна забіваць дзікіх жывёл?", "Ці з'яўляецца паляванне формай забойства?" і "Ці мае чалавек права адымаць жыццё ў дзікай жывёлы дзеля задавальнення ўласных патрэб?" і ў сувязі з апошнім пытаннем – "Якія матывы ўдзелу ў паляваннях з'яўляюцца этычна (маральна) апраўданымі?" Найчасцей прыродахоўныя арганізацыі і актывісту руху за правы жывёл выступаюць супраць ***спартыўнага*** і трафейнага паляўніцтва. Крытыкуюцца пераважна не тыя паляванні, якія маюць на мэце здабычу харчавання - неабходных у сістэме жыццезабеспячэння рэсурсаў жывёльнага паходжання, - а паляванні як форма адпачынку, арганізаваныя дзеля баўлення вольнага часу, задавальнення азарту і здабычы трафеяў.

У апошнія дзесяцігоддзі назіраецца імклівае скарачэнне колькасці зарэгістраваных паляўнічых Беларусі, якія аплацілі штогадовую дзяржаўную пошліну (2014 г. – каля 55 тыс. чалавек, 2015 г. – 52 тыс. чалавек, 2016 г. – менш за 51 тыс. чалавек, 2018 г. – 49,3 тыс. чалавек). Тэндэнцыя змяншэння колькасці зарэгістраваных беларускіх паляўнічых адбываецца з адначасовым ростам у грамадстве цікавасці да альтэрнатыўных паляванню відаў узаемадзеяння з жывёльным светам – назірання за жывёламі (у першую чаргу – бэрдвотчынг) і фотапалявання.

***Самаабмежаванні ў здабыванні дзічыны.*** Блізка да першага блоку этычных пытанняў далучаецца кола праблем, звязаных з сітуацыямі выбару – здабываць/не здабываць, страляць/не страляць па дзікай жывёле ў канкрэтным выпадку, пры пэўных абставінах (сітуацыйная этыка), колькі здабываць дзічыны. Традыцыйная сістэма ўзаемадзеяння чалавека і прыроднага ландшафту будавалася на прынцыпах, якія павінны былі забяспечыць доўгатэрміновае карыстанне ўзнаўляемымі прыроднымі рэсурсамі. Разам з тым, як сведчыць аўтар кнігі "Прырода і ўлада" Йахім Радкаў, шматлікія даследаванні сучасных паляўнічых народаў свету пацвярджаюць адсутнасць у чалавека-паляўнічага прыроднага інстынкту, які заклікаў бы яго да абмежавання ў выкарыстанні прыродных рэсурсаў. Намаганні паляўнічых, калі карыстацца сучаснымі катэгорыямі, у значнай ступені скіраваныя на атрыманне максімальнага кароткатэрміновага прыбытку [1, с.47]. Дадзены пункт гледжання актуальны і для беларускіх рэалій. Аднак сярод паляўнічых, асабліва людзей сталага ўзросту, зафіксаваны меркаванні аб неабходнасці ***самаабмежавання*** ў адстрэле дзічыны. Напрыклад, такія абмежаванні аргументуюцца колькасцю папуляцыі жывёлы ў пэўным рэгіёне (мала, таму не здабываю). *"Есьлі он [звер] не нада,* ***не может быть іспользаван****, я яго…* ***не ахочусь****. Дажэ тепер вот* ***када зайца нету****, з гоньчымі-то я ево і* ***не дабываю"***[1]. У інтэрв'ю старых паляўнічых сустракаецца матыў асуджэння звышпрагматычнага стаўлення да лясных дароў, да сітуацый, калі ўласная выгода паляўнічага ад эксплуатацыі

[1] Запісана ў 2010 г. ад Гуцуляка Юрыя Фёдаравіча, 1962 г. нар. у г. Іўе Гродзенскай вобласці.

PolotskSU



рэсурсу пачынае пераважаць над калектыўнымі інтарэсамі: *“**Старое поколеніе** относілось… **не было такого іждевенчества** … как вот в теперешней молодёжі… Тогда – вовремя пошлі… ні стрэлялі… лішнево. Стрэлялі … ілі лавілі той рыбы сколька нада была, а шчас жэ этава нет. **Ловят, сколька ловіца, бьют скока пападёт**”* [1].

Практычна ў кожнага паляўнічага існуюць свае “непажаданыя” для здабычы віды дзікіх жывёл і птушак. Некаторыя паляўнічыя прынцыпова не страляюць па капытных (казуля, лось), не здабываюць бáброў, вавёрак і інш.: “*Ну убіл я этаво бабра. Гаворыт, мяса харошае. Но я его **папробовал і я ел і меня ела.** Не хачу. **Я і лася не б’ю***”. *“Я в жызні сваёй **застрэліл аднаво глухара**. Эта велічэственная пціца...я здзелал чучэла … я ево не кушал… **і кушаць мне её не хочэцца і стрэляць саатвественa не хо[чэцца]***[2]. У сваёй аснове дадзеныя ўстаноўкі на самаабмежаванне ў здабычы пэўных паляўнічых відаў (калі яны не выкліканы прагматычнымі і рацыянальнымі матывамі) нярэдка маюць асабісты эмацыйны вопыт, пачуццё сімпатыі да пэўнага віду жывёл.

Не рэкамендуецца страляць у сітуацыях, калі ў жывёлы няма шанцаў выратавацца, у выпадках, якія супярэчаць самой ідэі спаборніцтва чалавека і дзікай жывёлы. Так, напрыклад, неэтычным лічыцца забіваць ***зайца ў лёжцы***[3]. Беларускія паляўнічыя неаднаразова адзначалі ў інтэрв’ю, што зайца ў лёжцы неабходна спачатку прымусіць падняцца (часам нават прыходзіцца паварушыць яго нагой), адпусціць на адлегласць і толькі тады зрабіць стрэл. У такіх умовах паляўнічы трапляе не заўсёды, здараецца, што жывёла сыходзіць. Прывядзем у якасці прыкладу аповед паляўнічага, які апроч іншага дэманструе механізм фарміравання (выхавання) этычных норм паводзін праз калектыўнае асуджэнне. У свой першы паляўнічы сезон Іосіф Іосіфавіч здабыў зайца ў лёжцы. Заяц ляжаў пад елкай і іншыя паляўнічыя яго не заўважылі, прайшлі міма. Малады паляўнічы зрабіў трапны стрэл, аднак рэакцыя старэйшых таварышаў была нечаканай: *“Што ты сдзелал? Я гавару “Убіл”. - ”Каво ты убіл? – Гавару “Зайца, шо ты не відзіш?” – “Эта ты не убіл, ты **паднял дахляка.**” **Дахляка.” …** І после этаво случая сколька я встрэчался на пахаце, в траве пакошанай, **зайцаў я нікагда нікагда іх ні растрэліваў лежачых**…”*[4]

Неэтычным лічыцца страляць па чарадзе качак не цэлячыся, а таксама па дзічыне, якая дрэнна бачна. Рэкамендуецца, па магчымасці, дабіраць (дабіваць) усіх падранкаў, не пакідаць пакалечаную жывёлу. Заўважым, што ў мінулым асобныя прыёмы і спосабы палявання сялян са стрэльбай стасаваліся з прынцыпамі рацыянальнага і ашчаднага выкарыстання прыродных рэсурсаў. Паводле М. Я. Нікіфароўскага, паляўнічы страляў толькі тады, калі быў упэўнены, што патрапіць у жывёлу, доўга прыцэльваўся, удакладняючы некалькі разоў палажэнне накірунку стрэльбы, каб быць упэўненым у спакойным стане дзічыны [2, с. CXLV]. Увогуле сяляне імкнуліся страляць па нерухомай дзічыне. І хаця ў сваёй аснове такія паводзіны мелі даволі прагматычныя матывы, у прыватнасці, эканомію зарадаў і павышэнне трапнасці стрэлу, яны адначасова змяншалі магчымасць з’яўлення падранкаў. Прывядзём аповед сельскага паляўнічага, запісаны ў 1960 – 1970-я гг., з дыялекталагічнага архіва Н.І. Гілевіча: “*...Гэта цяперака не шануюць ні патронаў, нічога, бо хапае. Вот папрыяжджаюць сынэ, дак **павыпшываюць гэтыя патроны так, абы-куды***…” [3, с. 58-59].

Паважлівыя адносіны паляўнічых да жывёлы праяўляюцца ў шырока распаўсюджанай забароне садзіцца на забітую жывёлу падчас фатаграфавання, дазваляецца рабіць фота толькі стоячы побач.

***Веснавыя паляванні.*** Надзвычай дыскусійным у нашай краіне застаецца пытанне аб веснавым паляванні на птушку. Большасць арнітолагаў, у першую чаргу ўдзельнікаў АПБ (“Аховы птушак Бацькаўшчыны”), выступаюць з ініцыятывай аб забароне альбо істотным абмежаванні палявання на вадаплаўную птушку ў Беларусі (у прыватнасці: абмежаваць працягласць сезону двума тыднямі, дазволіць паляванне на качак толькі з падсадной, на гусей – толькі на палях, вызначыць норму адстрэлу гусей – не больш за дзве птушкі на чалавека за дзень). Не выршыла супярэчнасцяў і новая рэдакцыя “Правілаў палявання”, якая ўступіла ў сілу 1 студзеня 2021 г. (указ №345 ад 16 верасня 2020 г.). Асноўныя змены ў новых правілах, якія датычаць паляванняў на птушку ўвесну – гэта забарона палявання на глушца ў Гродзенскай і Брэсцкай абласцях на 5 гадоў і выключэнне са спісу відаў, на качараў якіх дазволена паляванне ўвесну, чарнеці чырвонагаловай (Aythya ferina).

Праблема застаецца адкрытай і кожны паляўнічы робіць уласны выбар. Стаўленне беларускіх паляўнічых да веснавога палявання вар’іруецца. Шэраг апытаных аўтарам інфармантаў выказваліся з катэгарычным адмаўленнем дадзенага віду палявання: *“І вабшчэ весной я проціў этава. Весна! Вы панімаеце, што эта жэ любовь, а его тут бац – і убілі. Ён, бедны, распінаеца к этай утке ўвесь, аж раз – на цебе… Так што – я проціў весенняй ахоты”*[5], альбо падкрэслівалі індывідуальную непрымальнасць для сябе, аргументуючы рознымі фактарамі: “*Мы сельскіе жітелі і нам на пціцу ахотіцца весной меньшэ врэмені свободново, а вот зімой большэ свабодново… Ну, просто не ахоцівся ні атец, ні я ні ахочусь.”*[6].

У той жа час значная колькасць паляўнічых Беларусі лічыць веснавое паляванне на птушку асабліва цікавым і ўдзельнічае ў ім штогод (у тым ліку з выкарыстаннем падсадной качкі). Як прыхільнікі дадзенага віду палявання, так і яго праціўнікі, падкрэсліваюць, што не само веснавое паляванне, а недобрасумленнасць у выкананні правілаў яго правядзення, наносіць найбольшую шкоду прыродзе: *“К весенней?... Как на утку так я сагласен **нада правільна с падсадной, штоб стрэляць чотка селезня** … а не то што прышол, стрэльнуў, селезня паказаў, утку застрэліў”*[7]; ***“Без падсадной уткі эта ужэ не ахота”***[8]. Сярод аргументаў на карысць веснавога палявання падкрэслівалася яго даступнасць: *“Нельзя агранічываць. І многіе людзі, асобенна пажылова возраста, **эта едзінственная іх ахота, прадушына в жызні, дзе ані могуць атдахнуць**”*[9], а таксама папулярнасць сярод замежных аматараў палявання і ў сувязі з гэтым асаблівая фінансавая карысць для паляўнічай гаспадаркі.

---

[1] Запісана ў 2010 г. ад Дамжальскага Міраслава Леонцьевіча (старшыні першаснай ячэйкі Таварыства паляўнічых і рыбаловаў г. Ліды, эксперта рэспубліканскай катэгорыі па пародах і выпрабаваннях паляўнічых сабак) ў в. Токары Лідскага р-на Гродзенскай вобласці.

[2] Запісана ў 2011 г. ад Стахоўскага Анатоля Дзмітрыевіча, 1958 г. нар. (нарадзіўся ў Мсціслаўскім р-не Магілёўскай вобласці, пераехаў у Воршу ў 1982 г.) у г. Ворша Віцебскай вобласці.

[3] *Лёжка зайца* - гэта тое месца, дзе заяц кладзецца адпачываць пасля жыравання і хаваецца ад ворагаў.

[4] Запісана ў 2010 г. ад Кірвеля Іосіфа Іосіфавіча, 1938 г. нар. (нарадзіўся ў Шчучынскім раёне) у в. Токары Лідскага р-на Гродзенскай вобласці.

[5] Запісана ў 2011 г. ад Кожара Івана Іванавіча, 1924 г.нар. (нарадзіўся ў в. Аленавічы Талочынскага р-на) у г. Браславе Віцебскай вобл.

[6] Запісана ў ад Фурса Віктара Леанідавіча, 1957 г. нар. у в. Валеўка Навагрудскага р-на Гродненскай вобласці.

[7] Гл. спасылку 3.

[8] Гл. спасылку 2.

[9] Гл. спасылку 3.

PolotskSU



***Тэхналогіі паляўніцтва.*** Пад тэхналогіямі паляўніцтва ў дадзеным артыкуле разумеюцца спосабы здабычы дзікіх жывёл, а таксама прыстасаванні, якія выкарыстоўваюцца падчас паляванняў (зброя, рыштунак, транспарт). З крытэрыяў ацэнкі этычнасці тэхналогій паляўніцтва разгледзім наступныя: 1. узровень і працягласць пакут жывёлы 2. наяўнасць/адсутнасць рэалізацыі ідэі спаборніцтва, паядынку чалавека і жывёлы (наколькі жывёла мае шанец уратавацца). У адпаведнасці з дадзенымі крытэрыямі асобныя паляўнічыя тэхналогіі, апісаныя ў этнаграфічных крыніцах канца XIX – першай трэці XX ст., уяўляюцца бязлітаснымі і "варварскімі" з пункту гледжання сучаснай экалагічнай этыкі. Гэта, датычыцца, напрыклад, забіццё маладняка качак палкамі, прымянення самаловаў, якія прыносілі жывёле моцныя і працяглыя фізічныя пакуты; выкарыстанне атруты[1] і неспрыяльных для жывёл прыродных абставін (паляванне на ласёў па лёдзе). Аднак выкарыстанне дадзеных тэхналогій палявання для сялянскага асяроддзя першай паловы XX ст. найчасцей уяўляла сабой вымушаную жыццёвую неабходнасць і павінна ацэньвацца з улікам тагачасных рэалій.

Другі крытэрый ацэнкі этычнасці тэхналогій паляўніцтва (наяўнасць/адсутнасць рэалізацыі ідэі спаборніцтва, паядынку чалавека і жывёлы) у асяроддзі сучасных беларускіх паляўнічых рэалізуецца ў адмаўленні альбо асуджэнні выкарыстання новых высокатэхналагічных прыстасаванняў, якія дазваляюць павышаць эфектыўнасць паляванняў (цеплавізар, аптычны прыцэл, прыбор начнога бачання, лазерны дальнамер, паўаўтаматычная зброя і інш.)[2] Некаторыя паляўнічыя лічуць недастаткова спартыўным адстрэл дзікіх жывёл (капытных) з вышкі[3]: "*Я вот … не прíемлю вот эці* ***ахоты на кабана … с вышкі с падкормачнай плашчадкі****. Ты ему высыпал корм, он сідіт на вышке і он шчэтает герой, што он убіл этава кабана. Ну тада эта можа так утрыравана, но вазьміце в сарае тожэ самае корміш-корміш прышол нажом зарэзал. Ну здесь немножка как бы в другой інтэрпрэтацыі. Вот і всё.*"[4]

***Падзел дзічыны.*** Падзел здабытай дзічыны падчас калектыўных паляванняў звычайна ажыццяўляецца з улікам прыярытэтнага права таго, хто падстрэліў жывёлу, імкнуцца да роўнага (па магчымасці) размеркавання дзічыны паміж усімі ўдзельнікамі палявання, а таксама выкарыстоўваецца прынцып выпадковасці. Лічыцца няправільным, калі больш удачлівы стралок, які паехаў на паляванне ў кампаніі, забірае ўсе трафеі сабе. Звычайна здабытую дзічыну дзеляць паміж усімі ўдзельнікамі палявання: "*Скольki людзей, на стольki кускоў і дзелім, пасеклі-пасеклі, атварачываецца адзін і ўсім атдаець "Каму?" тот і забіраець*"[5].

***Паляванне з сабакамі.*** Неэтычным лічыцца страляць звера з-пад чужых ганчака альбо лайкі. А калі стрэл зроблены, то здабытая дзічына належыць уладальніку сабакі, а стралок атрымлівае толькі патрон у якасці кампенсацыі расходу боепрыпасаў: "*Так вот у ніх .. <параўноўвае з вопытам палявання ў Расіі>* ***с-пад тваей сабакі ніхто не будет стрэляць****. А у нас – кругом і рядом. Тока вот сабакі начэлі ганяць, всё смотрыш – как парціzаны падкрадаваюцца – Бах! <Я: Сваі, с каторымі Вы ідёте на ахоту?> Нет! Эці ні в шчот! Ну вот он вышел на ахоту. А у ніво сабакі нет. Всё. Он услышал, он пад эту сабаку – Трах-Бах! Убіл. В мішок – і пашол… Я держу-кармлю… Мне ні жалка. Да раді Бога. Патаму што дажэ эта традіція как бы предусматрівает і такое іскпючэніе : убіл с-пад чужой сабакі –* ***даждісь хазяіна, хазяін цебе должэн вернуть патрон****. Ты звера ему вазврашчаеш, а он цебе патрон… <Я: Это где Вы такую традіцію віделі?> Эта в Расіі. Она саблюдаеца. <Я: А у нас Вы встречалі?> Ну я чэсна сказаць пачті што не встрэчал. У нас такой традіціі нету… "*

**Вывады.** Паляўнічая этыка ўтварае асобны пласт беларускай паляўнічай культуры і ўваходзіць ва унутраны матывацыйныя кампанент, які ўплывае на сацыяльна і экалагічна значныя паводзіны чалавека ў працэсе асваення прыродных рэсурсаў. Паляўнічая этыка шчыльна звязана з суб'ектыўным светам пачуццяў, перажыванняў, імкненняў і індывідуальных маральных ацэнак чалавека. Спалучэнне дэскрыптыўнага і нарматыўнага падыходаў у вывучэнні этычных аспектаў паляўнічай культуры дазваляе разглядаць ПЭ не толькі ў класічным разуменні прафесійнай этыкі (калектыўны маральны вопыт), а таксама прасачыць сувязь ПЭ з суб'ектыўнымі перажываннямі паляўнічага, яго асабістым вопытам, індывідуальным разуменнем дабра і справядлівасці.

**Спіс выкарыстаных крыніц**

1. Радкау, Й. Природа и власть. Всемирная история окружающей среды. / Радкау Йоахим. – М. : Изд. дом Высшей школы экономики, 2014. – 472 с.
2. Никифоровский, Н.Я. Очерки простонародного житья-бытья в Витебской Белоруссии и описание предметов обиходности: (этнографические данные): с географическим видом Витебской губернии и четырьмя чертежами в тексте / Н.Я. Никифоровский. – Витебск : Губернская типография, 1895. – 552 с.
3. Апавядае беларуская вёска: успаміны пра перажытае: аповеды пра сямейныя гісторыі, пра розныя здарэнні і прыгоды: з дыялекталагічнага архіва Ніны Іванаўны Гілевіч: запісы 1960-х – 1970-х гадоў / укл., рэд. Н.С. Гілевіч. – Мінск : Про Хрысто, 2008. – 133 с.

**ETHICAL ASPECTS OF HUNTING CULTURE**

A. BABICH

*Hunting ethics (HE), which largely determines the socially and ecologically significant human behavior in the process of developing natural resources, is considered in the article as an independent and specific fragment of the hunting culture of Belarusians, including a set of moral problems and values associated with the production of wild animals. The combination of normative and descriptive approaches in the study of this issue allows us to consider HE not only in the classical understanding of professional ethics (collec-*

[1] На Віцебшчыне хатнюю атруту для дзікіх жывёл выраблялі з акісленай медзі, з зялёнага маку, з блёкату чорнага (Hyoscyamus niger).
[2] Падрабязней гл.: Морозов, А. Новые технологии в охоте / Алексей Морозов // Sports Afield. - 2014 - №1 - С.39-41.
[3] *Паляванне з вышкі на адкормачнай пляцоўцы* аднасіцца да паляванняў з засады. Паляўнічы размяшчаецца на вышцы вышынёй 10-15 метраў, дзе чакае выхаду звера.
[4] Гл. спасылку 2.
[5] Запісана ў 2008 г. Бабіч А.Ю., Пашкевічам І. Э. ад Білея Антона Пятровіча, 1949 г.нар. (нарадзіўся ў былым Сенькаўскім с/с былога Асвейскага р-на) у в. Антонава Верхнядзвінскага р-на Віцебскай вобл.

PolotskSU



*tive moral experience), but also to trace the connection between HE and the subjective experiences of the hunter, his personal experience, individual understanding of goodness and justice.*
***Key words:*** *tradition, hunting, trade, ethics, hunting ethics, animal resources, professional ethics, ethnology, Belarusians.*

УДК 821.161.3-31.09 (476.5) "19"

## ПАЭЗІЯ ЯК СРОДАК АСЭНСАВАННЯ ЭТНАКУЛЬТУРНАЙ СВОЕАСАБЛІВАСЦІ: НА МАТЭРЫЯЛЕ КНІГІ "ВЕЧАЛЛЕ" РЫГОРА БАРАДУЛІНА

**Бароўка В.Ю.**
Рэспубліка Беларусь, Віцебск

*Этнакультурная адметнасць Падзвіннння пасляваеннага часу ярка ўвасобілася ў кнізе паэзіі "Вечалле" Рыгора Барадуліна. Паэт раскрыў асаблівасці ландшафту, складу насельніцтва, роду яго заняткаў, выявіў этычныя імператывы жыхароў рэгіёна, паказаў наступствы Вялікай Айчыннай вайны для далейшага існавання Падзвіння. Р. Барадулін для перадачы этнакультурнай адметнасці Падзвіння абапіраўся на біяграфічны матэрыял і шырока ўжываў у мастацкай мове твораў дыялектызмы. Кніга паэзіі "Вечалле" – удалая спроба прэзентацыі і мемарыялізацыі Падзвіння 1950–1980-х гадоў.*
***Ключавыя словы:*** *Рыгор Барадулін.*

Літаратура – сродак выяўлення этнакультурнай спецыфікі і разам з тым сродак яе эстэтычна-аксіялагічнай рэпрэзентацыі. Роўна сорак гадоў таму выйшла кніга паэзіі "Вечалле" Рыгора Барадуліна. Назву ёй дало возера на Ушаччыне, натхнёным песняром якой быў выдатны беларускі пісьменнік другой паловы XX – пачатку XXI стагоддзя. Кніга паэзіі ўключала творы рознай тэматыкі, аднак скразной у ёй была тэма роднага краю. Р. Барадулін стварыў паэтычны летапіс Падзвіння пасляваеннага часу. Этнакультурная адметнасць гэтай тэрыторыі ў другой палове XX стагоддзя знайшла на старонках "Вечалля" яркае мастацкае ўвасабленне. Бясспрэчна, паэзія прайграе прозе ва ўсеахопнасці і дэталізацыі мастацкага адлюстравання, але істотна выйграе ў канцэнтраванасці, экспрэсіўнасці і эмацыянальнасці выяўлення аўтарскай думкі і ў падачы матэрыялу.

Кніга паэзіі раскрыла спецыфіку ландшафту Падзвіння. Навукоўцамі неаднаразова заўважана, што на фарміраванне ментальнасці, на род заняткаў жыхароў вялікі ўплыў аказвае прырода. Падзвінне ў "Вечаллі" – край раўнін, азёр і лясоў, месца цеснага судакранання свету чалавека і свету прыроды. Сувязь чалавека з родным кутам эмацыйна артыкулявана ў вершы "Вытокі", лірычны герой якога найвышэйшай узнагародай лічыць: "Пачуць ва Ўшачы першы гром / Пад бацькавым раскрылым вязам" [1, с. 134], "Чуць дома / Першага шпака" [1, с. 134]. Вечалле ў аднайменным вершы Р. Барадулін ўзнёсла называе: "Спадчыннае возера маё, / Вечнасцю прасвечанае / Вечалле" [1, с. 21]. Гэта возера – сімвал трываласці, вечнасці, упэўненасці ў бессмяротнасці жыцця: "Набрыдзі, як наледзі, было, / А глыбінь тваіх / Буза не ўсватала. / Дыхала ў любую сцюжу тхло, / Бегла ў свет / Рачулка сукаватая" [1, с. 14]. Вечалле, хоць і возера, у трактоўцы паэта, але яно не ізаляванае ад свету, а памкнёнае ў яго дзякуючы рачулцы, а значыць, вечнае. "Малады верш" ў кнізе паэзіі – арыгінальная, пабудаваная на нечаканых асацыяцыях, характарыстыка азёр і вечара на Падзвінні: "Блакітныя кастры азёр – / Ад іх агню смялей блакіту. / І вечар – электраманцёр / Нябеснага энергазбыту – / Уключыць зоры. / Будзе ноч / Асакавольтная / Цадзіцца. / І сэрца рушыць басанож, / Дзе пахне раніца ігліцай" [1, с. 91]. Надзвычайная сінь возера нараджае ў паэтычнай свядомасці аўтара параўнанне возера з кастром, вечар жа, які запальвае зоры, гумарыстычна атэстуецца "электраманцёрам нябеснага энергазбыту", свет прыроды і чалавека ў чарговы раз збліжаюцца таленавітым ураджэнцам Падзвіння. Акцэнтаваннем адметнасці ландшафту родных мясцін напоўнены верш "Смага": "Азёры Ушаччыны, / як жураўліны клін, / Што кіруецца ў вырай, / у край самоты" [1, с. 136]. Пра сябе паэт жартаўліва заўважае: "Абарыгену азёр / сінее паглядам Айчына" [1, с. 137]. Родная прырода, па логіцы разважанняў лірычнага героя верша "Урок фізікі", нараджае ў чалавека патрыятычныя пачуцці: "Да лесу, дзе плача жаўна, / Да рэчкі, да мілага схілу / Шчыльней прытуляе здаўна / Дацэнтрабежная сіла" [1, с. 282–283]. Р. Барадулін належаў да таго пакалення, якое з маленства было знітавана з прыродным асяроддзем. Пра нялёгкае дзяцінства сваіх равеснікаў ён заўважыў: "Ёсць памяць босых ног, / І ўеліся ў яе / З ракі жыцця трыснёг / І жвір, што стому п'е, / Сцяжыначак спалох / І ўпартасці жарства. / Парог / З усіх дарог / Сталіцай харáства / Ад першых крокаў стаў / Для босых хадакоў. / Не шкадаваў атаў / Спадманны луг вякоў. / Трыпутніку далонь / Гаіла боль бяды" [1, с. 27]. Роднае Падзвінне прыгадвалася лірычнаму герою паэта праз сугучча іншамоўных геаграфічных назваў са сваімі, напрыклад, шведскага "Ветэрна" і беларускага "Ветрына": "Вясна ўзяла аблогай замак: / Мне з Ветрынам / Ветэрна / Гучыць і лашчыць слых" [1, с. 253]. Для акцэнтавання адмысловай сувязі свайго і чужога і этнакультурнай адметнасці свайго Р. Барадулін супастаўляў элементы побыту розных народаў. Для прыкладу, у вершы "Сауна" паэт гумарыстычна супаставіў ушацкую і фінскую лазні і падкрэсліў: "Хто ў саўне не быў, – / Калі ласка, ва Ўшачы, / Тут лазня канкрэтна вам растлумачыць / Тэорыю духа. / І практыку веніка – / Лагоднага гаю злога пляменніка. / Смялей прадзірайся ў захмар'е пары, / З палка ў раку, / З ракі – на палок. / Знянацку сюжэт паваротам ашпарыць / І ў проламцы – / Эпілог!" [1, с. 234 –235].

Падчас Вялікай Айчыннай вайны Падзвінне ў паказе паэта з'яўлялася месцам барацьбы з фашызмам. У пасляваенны час нават выгляд лесу нагадваў пра нядаўнія баявыя дзеянні. Так, у вершы "Вырыс беларускага лесу" шматзначна заўважана, што беларускі лес – перш за ўсё партызанскі лес, загартаваны і знявечаны ў баях: "Партызанскага лесу вырыс, / Ён выразны ля ўсіх дарог. / Ці падлетак-падлесак вырас, / Ці лясун свой бярлог / Не ўбярог? / Поле помніць красу васількамі. / Лес нязломны ў густой дабраце. / Чым часцей / Яго страх высякае, / Тым часцейшы / Зялёна расце" [1, с. 165]. Лес у часы вайны быў абаронцам жыхароў Падзвіння, але вайна зрабіла яго і небяспечнай для чалавека тэрыторыяй, як сумна вядомы ў родных мясцінах паэта Матырынскі лес: "Гэты лес малады / Запаведным зрабіла вайна. / І гады, / І сляды / Абыходзяць яго, / Каб на міну не набрысці, / Не ўгнявіць, / Не ўстурыць перуны. / Цішыня ў забыцці, / Непрытомная, стыне з вайны. / Лес жалезны наскрозь – / Ні расці, / Ні буцвець, / Ні ўсыхаць. / Шэрас і сухарось / Ціха цiснуцца на сенажаць" [1, с. 19]. Вайна спустошыла Падзвінне. Для прыкладу, у вершы "Шавулічы" занатавана адна з трагедый мінулай вайны: "Засталася адна / Ад Шавулічаў вулка" [1, с. 29], бо яе 366

PolotskSU

МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

УСТАНОВА АДУКАЦЫІ
«ПОЛАЦКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ»

# БЕЛАРУСКАЕ ПАДЗВІННЕ: ВОПЫТ, МЕТОДЫКА і ВЫНІКІ ПАЛЯВЫХ І МІЖДЫСЦЫПЛІНАРНЫХ ДАСЛЕДАВАННЯЎ

Зборнік артыкулаў
V міжнароднай навуковай канферэнцыі
(Полацк, 15–16 красавіка 2021 г.)

Пад агульнай рэдакцыяй
канд. гіст. навук, дац. А.І. Корсак;
канд. гіст. навук В.У. Чараўко;
канд. гіст. навук, дац. У.Я. Аўсейчыка

Наваполацк
Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт
2021

PolotskSU

УДК 343.13(063)
ББК 67.410.2я431

Рэкамендаваны да выдання саветам гуманітарнага факультэта
Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта (пратакол № 3 ад 29.03.2021)

*Рэдакцыйная калегія:*

*А.І. Корсак,* канд. гіст. навук, дац. (адк. рэд.), заг. каф. гісторыі і турызму Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта;
*В.У. Чараўко,* канд. гіст. навук, дац. каф. гісторыі і турызму Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта;
*У.Я. Аўсейчык,* канд. гіст. навук, дац., дац. каф. гісторыі і турызму Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта.

*Рэцэнзенты:*

*С.В. Кулінок,* канд. гіст. навук, заг. аддзела публікацый Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь;
*Т.А. Джумантаева,* канд. культуралогіі, дац., дырэктар Нацыянальнага Полацкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка.

**Беларускае Падзвінне: вопыт, методыка і вынікі палявых і міждысцыплінарных даследаванняў :** зб. арт. V міжнар. навук. канф., Полацк, 15–16 крас. 2021 г. / Полац. дзярж. ун-т ; пад агульн. рэд. А.І. Корсак (адк. рэд.), В.У. Чараўко, У.Я. Аўсейчыка. – Наваполацк : Полац. дзярж. ун-т, 2021. – 272 с.
ISBN 978-985-531-737-2.

У зборніку змешчаны навуковыя артыкулы па выніках работы V міжнароднай навуковай канферэнцыі “Беларускае Падзвінне: вопыт, методыка і вынікі палявых і міждысцыплінарных даследаванняў”. Прадстаўлены вынікі антрапалагічных і археалагічных даследаванняў Беларускага Падзвіння і сумежных тэрыторый. Прыведзены новыя даныя аб гістарычных лёсах, матэрыяльнай і духоўнай спадчыне рэгіёна Паўночнай Беларусі ў шырокім храналагічным кантэксце (ад першабытных часоў да сучаснасці).

Разлічаны на прафесійных гісторыкаў, археолагаў, этнолагаў, антраполагаў, мастацтвазнаўцаў, студэнтаў гістарычных спецыяльнасцей ВНУ, краязнаўцаў і ўсіх, хто цікавіцца гісторыяй Беларусі.

**УДК 343.13(063)**
**ББК 67.410.2я431**

**ISBN 978-985-531-737-2** © Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт, 2021

PolotskSU

*Навуковае выданне*

**БЕЛАРУСКАЕ ПАДЗВІННЕ:
ВОПЫТ, МЕТОДЫКА і ВЫНІКІ ПАЛЯВЫХ
І МІЖДЫСЦЫПЛІНАРНЫХ ДАСЛЕДАВАННЯЎ**

Зборнік артыкулаў
V міжнароднай навуковай канферэнцыі
(Полацк, 15–16 красавіка 2021 г.)

Адказны рэдактар *А. І. Корсак*

Тэхнічнае рэдагаванне і камп'ютарная вёрстка
*І. М. Чапкевіч*
Дызайн вокладкі *М. С. Мухаморавай*

Падпісана да друку 20.05.2021. Фармат 60×84 $^{1}/_{8}$. Бумага афсетная. Рызаграфія.
Ум. друк. арк. 31,63. Улік.-выд. арк. 32,96. Тыраж 70 экз. Заказ 810.

Выдавец і паліграфічнае выкананне:
установа адукацыі «Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт».

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі
выдаўца, вырабніка, распаўсюджвальніка друкаваных выданняў
№ 1/305 ад 22.04.2014.

ЛП № 02330/278 ад 08.05.2014.

Вул. Блахіна, 29, 211440, г. Наваполацк.